тыў в. Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай вобласці, якім кіраваў Г.І. Цітовіч, хор в. Азершчына Рэчыцкага (кіраўнік Т.К. Лапаціна), Хойніцкі хор Хойніцкага раёнаў (кіраўнік І. Буцько) Гомельскай вобласці, Юравіцкі – Калінкавіцкага раёна Палескай вобласці пад кіраўніцтвам М. Дробніцы і М. Юшкевіч, Лунінецкі хор (Бэсан) Лунінецкага, Ганцавіцкі харавы калектыў (Н. Чапчыц) Ганцавіцкага раёнаў Пінскай абласцей. Паступова сельскае насельніцтва, асабліва моладзь, станавілася не толькі гледачом, але і ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці.

Найбольш сістэмнай культурна-асветная работа становіцца з канца 1940-х гадоў, калі абкомы і райкомы КПБ, райвыканкомы і раённыя Саветы народных дэпутатаў, райкомы ЛКСМБ сталі рэгулярна вывучаць стан культурна-асветнай работы і больш прадметна аказваць дапамогу работнікам клубаў, бібліятэк, хат-чытальняў. Адпаведна ўзрастала роля культурнай работы ў беларускай вёсцы. Поспехі залежалі ад ініцыятыўнасці і самастойнасці работнікаў культуры, падтрымкі сельсавета і наяўнасці моцнага актыву сельскай інтэлігенцыі.

Літаратура

1. Народное образование, наука и культура в СССР: стат. сборник / сост. Н.Я. Панферова. – М., 1977. – 448 с.
2. Постановления и решения за 1947 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2806. – Воп. 1. – Спр. 14.
3. Материалы проверки культпросветучреждений (1949 г.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2806. – Воп. 1. – Спр. 37.
4. Директивные указания (1946 г.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2806. – Воп. 1. – Спр. 8.
5. Отчеты о работе библиотек Минской области за 1955 г. // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Фонд 2316. – Воп. 1. – Спр. 40.
6. Информационые отчеты и доклады по работе культурно-просветительных учреждений и институтов за 1950 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 838. – Воп. 1. – Спр. 19.

## ВЫБАРЫ-2010 ВА УКРАІНЕ І ІХ УЗДЗЕЯННЕ НА РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ АДНОСІН

***Дз.В. Юрчак***

На 2009 г. прыйшлася актывізацыя беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва. У гэты час адбылося некалькі сустрэч на самых розных узроўнях, у тым ліку першы з 1997 г. афіцыйны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі ва Украіну. Апошняе сведчыла пра тое, што, нягледзячы на меўшую месца раней празаходнюю і антыбеларускую рыторыку ўкраінскага Прэзідэнта, В.А. Юшчанка зразумеў неабходнасць цеснага супрацоўніцтва з Беларуссю. Да гэтага яго падштурхоўвала геапалітычнае становішча дзвюх дзяржаў, агульная гісторыя і мяжа, цеснае эканамічнае супрацоўніцтва, якое ў 2004 – 2009 гг. дасягнула максімуму.

Але ў перыяд актывізацыі двухбаковых адносін стала ясна, што далейшае развіццё міждзяржаўнага супрацоўніцтва будзе адбывацца ва ўмовах змены ўлады ва Украіне. Пра гэта сведчылі сацыялагічныя апытанні, якія праводзіліся напярэдадні і падчас прэзідэнцкай кампаніі 2010 г. Шансы В.А. Юшчанкі на выбарах 2010 г. расцэньваліся як мінімальныя. Беларускі Прэзідэнт выдатна разумеў гэта, але тым не менш падчас сустрэчы са сваім украінскім калегам 5 лістапада 2009 г. ён, гаворачы пра будаўніцтва аўтатрасы “Кіеў-Мінск”, зазначыў “Мы з Віктарам Андрэевічам ужо пасля прэзідэнцкіх баталій абмяркуем гэтае пытанне…” [1. с.3]. Што азначала падобная заява? Магчыма адкрытую падтрымку В.А. Юшчанкі на выбарах. Хаця такі падыход выклікае вялікае сумненне. Хутчэй за ўсё гэта быў дыпламатычны крок А.Р. Лукашэнка.

Адной з асноў прадвыбарнай праграмы ўкраінскага прэзідэнта сталі яго знешнепалітычныя поспехі (у тым ліку ў адносінах з Беларуссю). Сапраўды, значным дасягненнем В.А. Юшчанка ў супрацоўніцтве з Беларуссю можна лічыць урэгуляванне ў лістападзе 2009 г. праблемы запазычанасці ўкраінскіх суб’ектаў гаспадарання перад Беларуссю за 1992 г. і абяцанне беларускага Прэзідэнта ратыфікаваць ў хуткім часе Дагавор аб дзяржаўнай мяжы ад 1997 г. Апошні быў вынесены Саветам Міністраў Беларусі на ратыфікацыю за 11 дзён да ўкраінскіх выбараў. Але наўрадці гэта магло паўплываць на выбар украінскага электарату. Ды і мэты такой кіраўніцтва Беларусі яўна прад сабою не ставіла.

Каментуючы прадвыбарную кампанію 2010 г. ва Украіне А.Р. Лукашэнка не аднойчы заяўляў, што на адносіны двух дзяржаў вынікі выбараў ніяк не паўплываюць, бо сярод кандыдатаў няма антыбеларускіх палітыкаў. Ужо пад час візіту ў Кіеў ў лістападзе 2009 г. беларускі Прэзідэнт акрамя В.А. Юшчанка сустрэўся з іншымі афіцыйнымі асобамі, якія таксама сталі кандыдатамі на



Репозиторий ВГУ

пасаду Прэзідэнта Украіны (Ю.У. Цімашэнка, У.М. Літвін) [2]. Да гэтага беларускі прэм'ер С.С. Сідорскі пад час рабочага візіту ў Кіеў сустракаўся і меў канструктыўную размову з яўным лідэрам прэзідэнцкай гонкі В.Ф. Януковічам.

Па выніках першага туру выбараў (17 студзеня 2010 г.) барацьбу за пасаду працягваюць два кандыдаты Ю.У. Цімашэнка і В.Ф. Януковіч. Іх прадвыбарныя платформы дазваляюць сцвярджаць, што цеснае супрацоўніцтва на постсавецкай прасторы застанеецца сярод прыярытэтаў украінскай знешняй палітыцы.

Абодва кандыдаты неафіцыйна называюцца прарасійскамі. Хаця падобныя сцвярджэнні вельмі ўмоўныя. Гэта абумоўлена тым, што іх "прарасійскасць" выяўляецца толькі на фоне спецыфічнай знешняй палітыкі яшчэ дзеючага Прэзідэнта. А пытанне паляпшэння адносін з Расіяй актыўна выкарыстоўваецца ў прадвыбарных гульнях. Але гэта не азначае, што абяцанні нармалізацыі адносін з Расіяй так і застануцца невыкананымі. У гэтым зацікаўлены эліты Украіны, якія прагнуць пераглядзець газавыя кантракты і дабіцца больш спрыяльных умоў у развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў, не губляючы пры гэтым цесных адносін з ЕС і ЗША. Таму новы Прэзідэнт Украіны для падтрымання свайго рэйтынгу і пад націскам гандлёва-прамысловых груп вымушаны будзе выконваць узятыя на сябе абяцанні, якія датычацца знешне-палітычнай стратэгіі Украіны.

Але гэта не прывядзе да актыўнага ўдзелу Украіны ў палітычных інтэграцыйных праектах на постсавецкай прасторы. Хутчэй за ўсё яна абмяжуецца толькі развіццём супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы. Да большага не гатовы украінскія эліты. Больш таго, падобнае разгортванне падзей не дапусціць Вярхоўная Рада, у якой ніводная партыя (і гандлёва-прамысловая група, што стаіць за ёю) не мае большасці, і наўрадці будзе яе мець у бліжэйшыя гады.

У такіх умовах, безумоўна, ёсць магчымасць для актывізацыі беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва. Нашыя дзяржавы, як і раней, зацікаўлены ў пашырэнні тавараздвароту, рэалізацыіі сумесных праектаў, збліжэнні пазіцый у энергетычнай і транзітнай палітыцы. Да гэтага, у тым ліку, падштурхоўвае "газавы" і "нафтавы" шантаж з боку энергетычных манапалістаў з якім сутыкунуліся абедзве дзяржавы. Акрамя таго, на павестцы дня застаюцца праекты ў рамках праграмы ЕС "Усходняе партнёрства". Усё гэта азначае, што новы прэзідэнт Украіны будзе працягваць развіваць тыя адносіны з Беларуссю, якія былі закладзены яго папярэднікам у 2009 г. і па магчымасці пашыраць двухбаковае супрацоўніцтва.

Літаратура

1. Кашликов, А. Устаканить Украину / А.Кашликов // БелГазета. – 2009. – 9 ноября – С. 3-4.
2. Кольченко, И. Киевские лавры / И. Кольченко // СБ – Беларусь Сегодня. – 2009. – 10 ноября. – С.3.

## СОВЕТСКАЯ ШКОЛА 1920-Х ГГ. В КОНТЕКСТЕ БОРЬБЫ ЗА НОВЫЙ СОВЕТСКИЙ БЫТ

***Г.Н. Яковлева***

Первое десятилетие советской власти – это время становления новой советской школы, которая в свою очередь, должна была сыграть огромную роль в политической социализации детей. Происходила переоценка ценностей, внедрялись новые идеалы, нормы жизни, стили поведения. В основу бытовых практик установка о воспитании нового советского человека как человека коллективного, человека-общественника, сознательно созидающего новое общество и самого себя. На борьбу со старым бытом население страны мобилизовали многочисленные советские организации. Общество по борьбе с неграмотностью учило граждан читать и писать, Общество воинствующих безбожников внедряло в массовое сознание атеизм. Дома санитарного просвещения и ячейки Союза обществ Красного креста прививали рабочим и крестьянам санитарно-гигиенические навыки.

Под воздействием западных теорий возник гигиенический этос воспитания детей (строгое соблюдение чистоты наряду с эмоциональной сдержанностью, а также скрупулезное наблюдение за физическим и умственным состоянием ребенка). Как на Западе, так и в Советской России складывается новый идеал ребенка – энергичного, эмоционально независимого, инициативного. Культивируются такие качества как физическое здоровье, опрятность, трудолюбие. Одежда пионеров 1920-х гг. по форме и стилю совпадала с «рациональной одеждой» в британской детской культуре этого же времени. Советские девочки, также как и их британские сверстницы, отвергали бантики, рюши, воланы. Как отмечает К. Келли: «Приезжающие в СССР журналисты, педагоги и медики, как ни тревожила их практиковавшаяся там, но их мнению, «индоктринация» детей, в целом горячо одобряли усилия Советского государства по преобразованию традиционной системы их воспитания. Критике подвергался не характер гигиенического идеала, а его неполное осуществление на практике».



Репозиторий ВГУ